# Багацце колераў

## Добрай традыцыяй стала арганізацыя мастацкіх выстаў напярэдадні вясны ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі



Ужо восем разоў ладзілася адкрыццё вернісажаў пад назвай «Кветкавы рай». Адбывалася гэта дзякуючы апантанасці і актыўнай жыццёвай пазіцыі іх нязменнага куратара. Але на гэты раз праект мае іншую назву — «Палітра вясны».

У гэтым годзе надвор'е нам падкідвае сюрпрызы, сапраўднай зімы мы так і не пабачылі, а фактычна пражылі паўгода ў шэрані восені. Воку не было за што зачапіцца… Нуда і сум…

І толькі калі павялічыўся светавы дзень, калі сонейка стала мацней прыграваць, наваколле стала мяняцца: прачнуліся пупышкі, зазелянелі палеткі. Першацветы паднялі свае галоўкі: прымулы, падснежнікі, мышыныя гіяцынты, крокусы, пралескі…

У першы веснавы месяц адзначаецца Міжнародны жаночы дзень — свята, у якое традыцыйна жанчынам дараць кветкі. На вуліцах гарадоў напярэдадні гэтага свята можна сустрэць часцей, чым у звычайныя дні, мужчын з кветкамі, а ў паветры з'яўляюцца ледзь улоўныя саладкаватыя ноткі мімозы, церпкія — гіяцынтаў, тонкія — цюльпанаў…

Вернісаж «Палітра вясны» увабраў у сябе ўсю шматколернасць гэтай пары года: блакіт неба, сонечнасць каташкоў вярбы, белую кіпень квітнеючых садоў… Ён нагадвае нам, што не за гарамі і лета, якое таксама вельмі багатае на колеры: у пачатку лета цвітуць касачы, півоні, эстафету падхопліваюць дэльфініумы, рамонкі,





званочкі, аксаміткі… Адным словам, кветкавы рай…

Галоўную мэту — падняць настрой, узбагаціць эмацыянальна, накіраваць думкі ў пазітыўнае рэчышча — выстава выраашае. Наведайце пры нагодзе вернісаж. Упэўнена, атрымаеце асалоду.

У праекце прынялі ўдзел як мастакі, імёны якіх добра вядомыя ў краіне і за





яе межамі, так і пачынаючыя майстры пэндзля. Таццяна Гардашнікава, Наталля Гедрановіч, Уладзімір Дзядзюля, Марыя Ісаёнак, Мікалай Ісаёнак, Іван Козел, Юрый Козел, Наталля Лебедзева, Таццяна Патворава, Дар'я Сумарава-Копач, Уладзімір Сытчанка, Ірына Ясюкайць-Дударава.

**Святлана Пятрова, фота аўтара**